# АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ВА ЎСТАНОВАХ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯТЛАЎСКАГА РАЁНА

***Гайдук Кацярына Аляксандраўна,***
*метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі*
*дзяржаўнай установы "Дзятлаўскі раённы*
*вучэбна-метадычнеы кабінет"*

Паважаныя калегі! Мяркую, нікога не патрэбна пераконваць у тым, што родная мова – гэта найважнейшае сувязное звяно ў далучэнні асобы да агульначалавечых каштоўнасцей. І чым раней адбываецца гэта далучэнне, тым інтэнсіўней праходзіць працэс развіцця пазнавальных, інтэлектуальных магчымасцей, творчых здольнасцей, паглыбляецца знаёмства з родным краем, традыцыямі, звычаямі, каштоўнасцямі і г.д.

Таму адной з галоўных задач дашкольнай адукацыі на сучасным этапе з'яўляецца не толькі далучэнне выхаванцаў да беларускай мовы, развіццё іх маўленчых здольнасцяў, але, у першую чаргу, фарміраванне ў маленькага чалавека свядомых адносін да роднай мовы.

Ва ўстановах дашкольнай адукацыі Дзятлаўскага раёна маецца свой станоўчы вопыт арганізацыі адукацыйнага працэсу на беларускай мове, актуальнымі формамі рэалізацыі якога выступаюць правядзенне заняткаў на беларускай мове ў адпаведнасці з вучэбным планам, нерэгламентаваныя віды дзейнасці, сумесная дзейнасць і зносіны дзяцей рознага ўзросту, шырокае ўкараненне ў практыку работы беларускіх народных святаў, фрагментаў абрадаў і г. д.

Разам з тым , вырашэнне задач эфектыўнага засваення роднай мовы дзецьмі дашкольнага ўзросту ва ўмовах двухмоўя абумовіла неабходнасць удасканалення існуючых падыходаў да стварэння камунікатыўнага і прадметна-пpасторавага асяроддзя.

Прымаючы да ўвагі, што рашэнне дадзеных праблем немагчыма без адпаведнага ўзроўню прафесійных кампетэнцый педагогаў, намі была праведзена работа па стварэнні неабходных ўмоў для прафесійных і асабовых зносін педагагічных работнікаў на беларускай мове ў рамках дзейнасці раённых метадычных аб'яднанняў.

Лічым, што паспяховымі крокамі ў дадзеным накірунку стала ўключэнне з мінулага навучальнага года ў паседжанне кожнага раённага метадычнага аб'яднання правядзенне моўных акцый "Сёння гаворым толькі па-беларуску", "Надоело говорить – размаўляй!", "Рускай мове дай разгрузку, размаўляй па-беларуску!", моўных трэнінгаў, дыктовак, віктарын, адкрытых праглядаў заняткаў, выступленняў, кансультацый на беларускай мове, выкарыстанне гульнёвых метадаў актывізацыі беларускага маўлення педагагічных работнікаў.

Самай папулярнай стала гульня "Караоке па-беларуску", якую я не толькі прапаную зараз вашай увазе, але і запрашаю Вас стаць яе актыўнымі ўдзельнікамі. Згодны? Тады пачнём!

Паважаныя ігракі! Увага на экран! Тут зашыфравана назва беларускіх песень. Спачатку вы павінны пазнаць назву, назваць аўтараў, а затым выканаць урывак з гэтай песні разам, тэкст слоў прапануецца на экране.

*(Беларускія народныя песні "Купалінка" і "Касіў Ясь канюшыну").*

Прыярытэтнымі ў метадычнай рабоце з кіраўнікамі ўстаноў дашкольнай адукацыі сталі мерапрыемствы, накіраваныя на ўдасканаленне падыходаў да арганізацыі

адукацыйнага працэсу на беларускай мове, пабудове прадметна-прасторавага асяроддзя з улікам рэгіянальнага кампаненту.

Актуальнымі ў рабоце з кадрамі сталі паседжанні метадычных аб'яднанняў выхавальнікаў дашкольнай адукацыі без кваліфікацыйнай катэгорыі і другой кваліфікацыйнай катэгорыіі па тэме: "Развіццё беларускага маўлення дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту", першай і вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорый па тэме "Лінгвакультуралагічны падыход да развіцця маўлення і культуры маўленчых зносін у дзяцей дашкольнага ўзросту".

Праца творчай групы педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання была накіравана на распрацоўку сцэнарыяў правядзення штоквартальных тыдняў беларускай мовы, інтэлектуальных гульняў, картатэк праблемных сітуацый "Як гэта сказаць па-беларуску". Такі падыход садзейнічае распаўсюджанню і абмену вопытам работы, трансляцыі новых ідэй і метадычных знаходак па папулярызацыі і пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы.

З улікам адзінай метадычнай тэмы актуальным у раёне стала правядзенне пашыраных паседжанняў метадычных фарміраванняў намеснікаў загадчыкаў і выхавальнікаў дашкольнай адукацыі першай і вышэйшай кваліфікацыйнай катэгоры па тэме "Далучэнне дзяцей дашкольнага ўзросту да нацыянальнай культуры, беларускай мовы сродкамі праектнай дейнасці", што сайдзейнічала развіццю і ўмацаванню сувязей паміж адміністрацыяй і спецыялістамі ў вырашэнні абазначанай адзінай задачы.

Паседжанні клуба педагагічных сустрэч "Імпульс" кіраўнікоў фізічнага выхавання былі накіраваны на забеспячэнне пераемнасці ў рабоце кіраўнікоў фізічнага выхавання і выхавальнікаў дашкольнай адукацыі па пытаннях рэалізацыі адукацыйных галін "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін" і "Фізічная культура".

Вынікам працы метадычнага аб'яднання музычных кіраўнікоў стала распрацоўка календара народных свят і абрадаў, стварэнне зборніка метадычных распрацовак з вопыту работы «Народнаму скарбу век векаваць» з аўтарскімі электроннымі матэрыяламі іх правядзення.

Падкрэслю, што ў межах работы кожнага метадычнага аб'яднання адбываліся выставы-прэзентацыі дыдактычных матэрыялаў, у тым ліку накіраваных на вырашэнне асноўных задач моўнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту, а менавіта выхаванне гукавой культуры, узбагачэнне, удакладненне і актывізацыя слоўніка, фарміраванне граматычнага ладу маўлення, яго звязнасці пры пабудове разгорнутага выказвання.

Па асобных тэмах педагагічнымі работнікамі падрыхтаваны прэзентацыі, расрацаваны камп'ютарныя гульні, віртуальныя падарожжы па славутых мясцінах краіны,горада, вёскі, творчай групай педагагічных работнікаў ДЦРР №2 г. Дзятлава распрацаваны комплекс дыдактычных гульняў для інтарактыўнай дошкі "Мая радзіма Беларусь", які складаецца з 7 гульняў як на беларускай, так і на рускай мовах.

Як вынік праведзенай метадычнай работы з кадрамі – удасканаленне моўных кампетэнцый спецыялістаў устаноў дашкольнай адукацыі, прадметна-прасторавага асяроддзя, стварэнне неабходных умоў для больш якаснага правядзення розных відаў гульнёвай дзейнасці на паветры.

Для прыкладу, абсталяваныя на ценявых навесах у Дварэцкім, Гезгалаўскім яслях-садах, яслях-садзе №1 г. Дзятлава музычна-тэатральныя пляцоўкі дазволілі на больш якасным узроўні арганізаваць розныя віды мастацкай дзейнасці на свежым паветры.

Створаныя ўмовы для арганізацыі сюжэтна-ролевых гульняў «Белпошта»,

«Заправачная станцыя”, “Кафэ “Бульбашык”, “Купалінка” на групавых пляцоўках у Казлоўшчынскім, Гезгалаўскім яслях-садах, Хвінявіцкім дзіцячым садзе - сярэдняй школе, яслях-садзе №1 г. Дзятлава далі магчымасць дзецям весці дыялог на беларускай мове, заказваць беларускія нацыянальныя стравы, слухаць беларускія песні, гуляць у беларускія народныя гульні.

Шырокае выкарыстанне ў Дварэцкім яслях-садзе такой формы работы, як “казка ў чамадане”, дапамагае ўлічыць такі асноўны прыцып пабудовы асяроддзя, як мабільнасць.

Паспяховым у дадзеным накірунку стала і ўнясенне нацыянальнага кампанету ў змест развіваючага прадметна-прасторава асяроддзя.

Так, у ценявым навесе Казлоўшчынскага яслей-сада абсталявана тэматычная гульнёвая пляцоўка “Мінулая і сучасная хата”, у Раклевіцкім дзіцячым садзе-базавай школе і ў Гезгалаўскім яслях-садзе – “Сучасны хатні пакой з элементамі народнага побыту”, у Міроўшчынскім дзіцячым садзе і ў яслях-садзе №1г. Дзятлава – “Беларуская хатка”.

Педагагічнымі работнікамі Новаяльнянскага і Дварэцкага яслей-садоў аформлены стэнд-карты “Падарожжа па Беларусі”, “Падарожжа па вёсцы Дварэц”, дзе сабраны матэрыялы, праз якія выхавальнікі фарміруюць у дзяцей любоў да роднай зямлі, яе традыцый, гісторыі. Дзеці маюць магчымасць знаёміцца са славутасцямі аграгарадка Дварэц па стэнд-карце, а затым здзяйсняць паходы-экскурсіі па роднай вёсцы, складаць расказы рэалістычнага зместу, у выніку чаго папаўняецца актыўны слоўнікавы запас дзяцей.

Асобнае месца ў групах ясляў-сада №1 г. Дзятлава займаюць лялькі-экскурсаводы ў беларускай нацыянальнай вопратцы, беларускія нацыянальныя лялькі, такія як Крупенічка, Падарожніца, Званочак, Абярэг-матанка і інш., зробленыя рукамі педагагічных работнікаў і бацькоў.

У радзе ўстаноў дашкольнай адукацыі створаны музейныя куткі са зменнымі экспазіцыямі, якія ўключаюць у сябе спецыяльна распрацаваныя матэрыялы па культуры беларускага народа, звесткі аб знакамітых земляках, беларускіх святах, абрадах, у тым ліку і сваёй мясцовасці і г.д.

З мэтай рэалізацыі задач патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення, рэалізацыі задач Года малой радзімы творчым калектывам педагогаў ДЦРДз створана сюжэтна-дыдактычная гульня “Турагенцтва”, назапашана дастатковая колькасць наглядных матэрыялаў аб жывапісных мясцінах Беларусі, Гродзенскай вобласці, малой радзімы – Дзятлаўшчыны.

Ва ўсіх установах створаны ўмовы для сюжэтна-ролевай гульні “Крама”, маецца аддзел “Беларускі сувенір”. Асаблівая ўвага нададзена размяшчэнню макетаў тавараў з брэндам “Зроблена ў Беларусі”, тавараў, выпушчаных на прамысловых прадпрыемствах Дзятлаўшчыны. Такім чынам, нашы выхаванцы лёгка арыентуюцца ў беларускіх таварах, таварах мясцовай вытворчасці, ведаюць, што прадукцыя мясцовых гандлёвых марак значна таннейшая, а значыць, купляючы яе, сям’я эканоміць бюджэт.

Маецца ў групах ДЦРДз №2 г. Дзятлава і гульнёвы матэрыял “Міні-філіял рэдакцыі раённай газеты “Перамога”, дзякуючы чаму дзеці старшага дашкольнага ўзросту змогуць пабыць карэспандэнтамі, фатографамі.

Створаны ў групах ўмовы і для арганізацыі сюжэтна-ролевай гульні “Белпошта”.

Правядзенне раённага агляду-конкурсу творчых работ “Лепшы дарослы і дзіцячы тэматычны касцюм” дазволіла папоўніць і абнавіць матэрыяльную базу ўстаноў

дашкольнай адукацыі нацыянальнымі касцюмамі, касцюмамі для пастаноўкі танцаў, гульняў-драматызацый па матывах як рускіх, так і беларускіх народных казак.

Як вядома, арганізацыя камунікатыўнага працэсу навучання беларускай мове магчымая толькі ва ўмовах рэальных маўленчых зносін або набліжаных да іх.

Штогод з улікам пажаданняў бацькоў выхаванцаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі раёна з рускай мовай навучання функцыянуюць беларускамоўныя групы, адукацыйны працэс у якіх ажыццяўляецца з выкарыстаннем вучэбных выданняў, зацверджаных або дапушчаных у якасці адпаведнага віду выдання Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і здзяйсняецца цалкам на беларускай мове. Выключэнне складаюць гадзіны, якія адведзены на вывучэнне рускай мовы адзін раз на тыдзень, з дзецьмі ад 4 да 7 гадоў – з першага паўгоддзя, з дзецьмі  ад 3 да 4 гадоў – з другога паўгоддзя. Педагагічныя работнікі ў межах выканання задач вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі паступова  папулярызуюць беларускую мову праз усе віды дзейнасці: заняткі, гульні, працу, пазнанне свету. На занятках па адукацыйных галінах "Музычная дзейнасць" і "Фізічная культура" дзеці таксама чуюць роднае слова.

Работа ў дадзеным накірунку дае станоўчыя вынікі. Вось да прыкладу, хлопчыкам і дзяўчынкам Казлоўшчынскага ясляў-сада, якія наведваюць беларускамоўную групу, яшчэ толькі па 4 гады, але яны ўжо даволі "прафесійна" даюць сваім татам і мамам, дзядулям і бабулям урокі беларускай мовы. Аб гэтым нам паведамілі менавіта бацькі. Увага на экран.

І яшчэ ёсць адзін вельмі прыемны факт. Маленькія беларусы Казлоўчынскага ясляў-сада маюць магчымасць працягнуць навучанне на роднай мове ў Казлоўшчынскай сярэдняй школе, дзе штогод акрываюцца беларускамоўныя класы.

Пры адсутнасці дастатковай колькасці дзяцей для фарміравання асобнай групы ва ўстановах адукацыі праводзіцца мэтанакіраваная работа па фарміраванні ў выхаванцаў устойлівай цікавасці да беларускай мовы, развіцці пазнавальных і маўленчых здольнасцяў: у адпаведнасці з вучэбным планам дашкольнай адукацыі праводзяцца заняткі па рэалізацыі адукацыйнай галіны "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін" у першым паўгоддзі 1 раз на тыдзень з дзецьмі ад 4 да 6 гадоў, у нерэгламентаванай дзейнасці з дзецьмі  да 4 гадоў.

Станоўчым з'яўляецца той факт, што з бягучага навучальнага года на заканадаўчым узроўні ёсць магчымасць рэалізацыі вышэйназванай адукацыйнай галіны, пачынаючы з другога паўгоддзя, з дзецьмі другой малодшай групы ў спецыяльна арганізаванай дзейнасці ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання.

Пры рэалізацыі зместу адукацыйнай галіны "Мастацкая літаратура" ў  спецыяльна арганізаванай дзейнасці з дзецьмі ад 2 да 4 гадоў выкарыстоўваюцца творы мастацкай літаратуры і фальклору на беларускай мове. Пачынаючы з сярэдняй групы, у спецыяльна арганізаванай дзейнасці выкарыстоўваюцца творы мастацкай літаратуры як на рускай, так і на беларускай мовах.

Дадатковым рэсурсам арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання стала правядзенне адзін раз на месяц у малодшых і адзін раз на тыдзень у сярэдніх і старшых групах беларускамоўнага дня. У ДЦРДз №2  г. Дзятлава, яслях-садзе №1 г. Дзятлава праводзіцца адзін раз на квартал тыдзень беларускай мовы.

У штодзенную практыку асобных устаноў дашкольнай адукацыі ўвайшло правядзенне моўных хвілінак "Кожны дзень беларуская казка, верш, прыказка,

прымаўка". Такі падыход дае магчымасць навучаць дзяцей беларускай мове ў сітуацыі «адна асоба – адна мова».

Усе заняткі пабудаваны па тэматычным прынцыпе, г.зн. практыкаванні і выказванні дзяцей пачынаюць, працягваюць і развіваюць адну тэму. Тэмы, у межах якіх вырашаюцца адукацыйныя задачы, педагагічныя работнікі ўсіх установ дашкольнай адукацыі падбіраюць так, каб яны выклікалі цікавасць, а таксама неслі ў сабе сацыяльную значнасць для грамадства, сям'і, краіны, напрыклад, "Мая родная старонка", "Кніга-сябар", "Дарагая тая хатка, дзе нарадзіла мяне матка" і г.д.

Хочацца канстатаваць значнае павышэнне ўзроўню правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных Міжнароднаму дню роднай мовы, ва ўсіх установах дашкольнай адукацыі. Да прыкладу, у ДЦРДз №2 г. Дзятлава усе супрацоўнікі размаўлялі па-беларуску. Каб бацькам выхаванцаў было лягчэй знаходзіць словы падчас гутаркі, на стэндах прапанаваліся падказкі "Ветлівыя словы", "Апранаемся па-беларуску" і г.д.

Каб бліжэй пазнаёміцца са знакамітымі людзьмі малой радзімы, выхаванцы 4-6 гадоў наведалі гарадскі музей. Дзеці ўбачылі выставу работ мастака-кераміста, скульптара Мікалая Несцярэўскага. Яны даведаліся, што работы нашага земляка знаходзяцца ў музеях гарадоў Мінска, Гродна, Валгаграда, а ў горадзе Мінску станцыя метро "Кастрычніцкая" аздоблена яго рукамі.

Сацыяльнае апытванне сярод бацькоў паказала, што адной з самых цікавых і запатрабаваных стала моўная акцыя "Сэлфі па-беларуску", па ўмовах правядзення якой неабходна было прачытаць верш на беларускай мове або загадаць загадку, патлумачыць прыказку або прымаўку, а затым разам з дзецьмі зрабіць фотаздымак на фоне выяў роднага горада.

Штогод ладзіцца завочны фестываль-конкурс сюжэтных гульнявых праграм "Забава" з выкарыстаннем беларускіх народных гульняў. У кампазіцыйную пабудову кожнага сюжэту ўключана дзейнасць тэматычных пляцовак "У гасцях у Несцеркі" (яслі-сад № 1 г.Дзятлава"), "У госці да бабулі Алены" (Гезгалаўскі яслі-сад), "На падворку ў бабулі" (Дварэцкі яслі-сад) і г.д. Такі падыход дазваляе прадэманстраваць магчымасці выкарыстання патэнцыялу гульні ў фарміраванні патрыятычных пачуццяў, развіцці камунікатыўных навыкаў дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах білінгвізму, бо менавіта прысутнасць у народных гульнях дыялогу спрыяе ўзбагачэнню і актывізацыі слоўніка выхаванцаў, авалоданню імі інтанацыйнымі сродкамі выразнасці беларускага маўлення, дапамагае засваенню вобразных эпітэтаў.

Правядзенне раённага агляду-конкурсу «Вясёлка дзяцінства» было накіравана на далучэнне выхаванцаў да мастацкага слова, развіццё навыкаў выразнага выканання вершаваных твораў як на рускай, так і на беларускай мовах, удасканаленне гукавымаўляльнага боку мовы, пашырэнне спектру мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё творчых здольнасцей дзяцей. Падчас правядзення мерапрыемства ўдзельнікі прадэманстравалі дастаткова высокі ўзровень падрыхтоўкі, сцэнічную і моўную культуру.

Дзеці старшага дашкольнага ўзросту штогод прымаюць удзел у інтэлектуальным конкурсе "Любазнайка", па ўмовах якога адказваюць на пытанні па адукацыйных галінах "Дзіця і грамадства", "Развіццё мовы і культура маўленчых зносін", "Мастацкая літаратура".

Далучэнне дзяцей да вытокаў народнай культуры, развіццё беларускага маўлення немагчыма без паслядоўнай, мэтанакіраванай работы з бацькамі. Толькі тады, калі бацькі

будуць зацікаўлены ў тым, каб іх дзіця ведала сваю родную мову, нашы намаганні не знікнуць дарма. З гэтай нагоды змянілі падыходы да арганізацыі работы з бацькамі, больш сталі выкарыстоўваць актыўныя формы.

У Новаяльнянскім яслях-садзе – бацькоўскія вячоркі, Гезгалаўскім яслях-садзе – сапраўдныя "Тэатральныя вечарыны", дзе падчас антракту праводзяцца трэнінгі "Гавары са мной па-беларуску", "Развіваем пальчыкі — развіваем маўленне" і шмат іншага.

На ўзроўні раёна праведзены педагагічны марафон "І завітала ў госці беларуская казка", па ўмовах правядзення якога сярод абавязковых удзельнікаў – бацькі выхаванцаў (выконваюць ролі, аказваюць дапамогу ў стварэнні дэкарацый, касцюмаў і г.д.).

Патрэбна адзначыць, што ўжо на першым этапе марафона ўстановамі дашкольнай адукацыі быў прадстаўлены вопыт работы па папулярызацыі сферы выкарыстання беларускай мовы. Удзельнікі дэманстравалі працэс арганізацыі і правядзення дыдактычных гульняў, гульняў-драматызацый, сюжэтна-ролевых гульняў і г.д.

На другім этапе – вынікі сумеснай дзейнасці з дзецьмі на беларускай мове. Удзельнікі дэманстравалі свае творчыя і моўныя здольнасці праз удзел у тэатральных пастаноўках паводле беларускіх народных казак, асобныя ролі выконвалі бацькі.

Значная ўвага ў рабоце з сям'ёй нададзена і вывучэнню станоўчага вопыту работы і яго распаўсюджванню. Так, у рамках правядзення педагагічнага марафона "Яе Вялікасць Сям'я" выяўлены станоўчыя вынікі дзейнасці па развіцці навыкаў вуснага як рускага, так і беларускага маўлення, прадстаўлены лепшы вопыт сямейнага выхавання па далучэнні не толькі бацькоў, але бабуль і дзядуль да ўдзелу ў адукацыйным працэсе шляхам рэалізацыі праектаў сямейнага выхавання па тэме "Нам традыцыі сямейныя патрэбныя".

Матэрыялы з вопыту работы педагагічных работнікаў Дзятлаўскага раённага вучэбна-метадычнага кабінета, устаноў дашкольнай адукацыі па развіцці беларускага маўлення неаднаразова былі абагульнены і надрукаваны ў "Настаўніцкай газеце", прафесійным часопісе "Пралеска", а ў 2018 годзе комплексна прадстаўлены ў першым нумары часопіса "Пралеска" – 7 публікацый.

Неабходна адзначыць, што далучэнне дзяцей да роднай мовы – адказная і складаная задача, вырашэнне якой у дашкольным узросце толькі пачынаецца. Аднак мы ўпэўнены, што арганізаваная беларускамоўная адукацыйная прастора ва ўстановах дашкольнай адукацыі раёна, планамерная, сістэмная работа, выкарыстанне разнастайных сродкаў выхавання, агульныя намаганні ўстаноў дашкольнай адукацыі і сям'і дадуць станоўчыя вынікі і стануць грунтоўным падмуркам для далейшай работы на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

І яшчэ аб адным. У мінулым навучальным годзе дзеці сярэдняга і старшага дашкольнага ўзросту прынялі ўдзел у фестывалі дзіцячай творчасці "Вясёлка талентаў", які праводзіўся ў дзвюх намінацыях "Тэатральная дзейнасць" і "Музычная дзейнасць". Пераможца фестывалю " Вясёлка талентаў", выхаванка Гезгалаўскага ясляў-сада Санюк Нэлі з песняй " Бульба".

Спадзяюся, што сістэма работы па арганізацыі адукацыйнага працэсу на беларускай мове ва ўстановах дашкольнай адукацыі Дзятлаўскага раёна будзе карыснай калегам з іншых рэгіёнаў рэспублікі.